**Ермаковіч Л.І.**

## КРЫМСКАЯ (ЯЛЦІНСКАЯ) КАНФЕРЭНЦЫЯ Ў ЛЁСЕ ПАСЛЯВАЕННАЙ ЕЎРОПЫ

Напярэдадні завяршальных udaraў узброеных сіл Аб'яднаных Нацый па фашысцкай Германіі кіраўнікі ўрадаў Савецкага Саюза, Вялікабрытаніі і Злучаных Штатаў Амерыкі сустрэліся ў Ялце. У канферэнцыі, якая працягвалася з 4 па 11 лютага 1945 года, прынялі ўдзел Старшыня Савета Народных Камісараў СССР І. Сталін, прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі У. Чэрчыль і прэзідэнт ЗША Ф. Рузвельт.

Сама думка аб чарговай сустрэчы кіраўнікоў "вялікай тройкі", як можна меркаваць з гістарычных крыніц, першапачаткова ўзнікла ў кіраўнікоў Вялікабрытаніі і ЗША і была прапанавана імі І. Сталіну ў ліпені 1944 года [2, с. 288]. Гэта быў час, калі Чырвоная Армія вяла трыумфальнае наступленне на савецка-германскім фронце, вынікамі якога сталі ўжо амаль поўнае вызваленне савецкай тэрыторыі і пачатак вызвалення краін Усходняй Еўропы.

Зразумела, што час прапанаванай сустрэчы быў абраны невыпадкова. У. Чэрчыль і Ф. Рузвельт добра разумелі, што канчатковы разгром фашысцкай Германіі непазбежны і што з гэтай задачай Чырвоная Армія ў стане справіцца самастойна. Таму іх хвалявалі як лёс вызваленых савецкімі войскамі усходнеўрапейскіх краін, так і сферы іх уплыву ў пасляваеннай Еўропе, якія ў значнай ступені залежалі ад лёсу гэтых краін. Натуральна, што І. Сталіну на дадзеным этапе ва ўмовах катастрафічных паражэнняў германскай арміі такая сустрэча была непатрэбна. Таму ён ад яе адмовіўся, спаслаўшыся на тое, што "в данное время, когда советские армии ведут бои по такому широкому фронту, все более развивая свое наступление, я лишен возможно-



Репозиторий ВГУ

сти выехать из Советского Союза и оставить руководство армиями даже на самое короткое время” [2, с. 291].

Лідэры Вялікабрытаніі і ЗША працягвалі настойваць на правядзенні сумеснай сустрэчы з І. Сталіным. Напрыканцы верасня 1944 года яны прапанавалі яму сустрэцца ў Гаазе. Аднак і на гэты раз І. Сталін знайшоў падставу, каб адмовіцца ад сустрэчы. У пісьме У. Чэрчылю ад 4 кастрычніка 1944 года ён адзначыў: “Конечно, у меня имеется большое желание встретиться с Вами и Президентом. Я придаю этому большое значение с точки зрения интересов нашего общего дела. Однако в отношении себя я вынужден сделать оговорку: врачи не советуют мне предпринимать большие поездки. На известный период мне придется с этим считаться» [2, с. 307].

Мяркуем, што У. Чэрчылю і Ф. Рузвельту вельмі добра былі зразумелыя сапраўдныя прычыны адмовы савецкага лідэра ад сустрэчы, бо на ёй абавязкова былі б акрэслены палітычныя рамкі паводзін яе удзельнікаў у вызваляемай Еўропе, што, натуральна, І. Сталіну было непатрэбна, які ўжо адчуваў сябе пераможцам у вайне. І толькі тады, калі лёс Германіі ўжо вызначыўся – Чывоная Армія заняла ўсходнееўрапейскія краіны – Польшчу, Румынію, Венгрыю, Балгарыю, І. Сталін пагадзіўся на сустрэчу з кіраўнікамі Вялікабрытаніі і ЗША, якая, прынамсі, адбылася на тэрыторыі СССР.

Такім чынам, да пачатку Крымскай канферэнцыі капітуляцыя Германіі была пытаннем некалькіх месяцаў, у той час, як сітуацыя з Японіяй у палітычнага кіраўніцтва ЗША яшчэ да канца не была высветленай. Начальнікі штабоў амерыканскіх узброеных сіл паведамлялі свайму прэзідэнту, што без удзелу Савецкага Саюза вайна супраць Японіі аднымі амерыканскімі сіламі будзе працягвацца не меней 18 месяцаў, гэта значыць да сярэдзіны 1946 года [1, с. 219]. Да гэтага часу амерыканцы вызвалялі краіны і абтокі, якія былі акупіраваны японцамі ў Азіі і на Ціхім акіяні, і неслі пры гэтым вялікія страты. Цяпер на чарзе стаяла высадка ў самой Японіі, якая, на думку амерыканскіх стратэгаў, будзе каштаваць сотняў тысяч жыццяў амерыканскіх салдат. Як высветлілася апасля, гэтыя разлікі аказаліся памылковымі, паколькі Японія знаходзілася на зыходзе сіл, нават без выкарыстання амерыканскіх атамных бомбаў. Верагодна, што амерыканскі прэзідэнт, добра ведаючы зацятасць японцаў у вайне на Ціхім акіяне, і баючыся вялікіх страт амерыканскай арміі пры высадцы ў Японіі, разлічваў схіліць І. Сталіна да ўдзелу ў вайне супраць Японіі [1, с. 220]. Да таго ж прэзідэнт, верагодна, улічваў, што ў адрозненне ад заходняй стратэгіі максімальна эканоміць жыццё салдат, стратэгія І. Сталіна і яго генералаў была заснавана на масіраваным і безаглядным выдаткаванні салдацкіх жыццяў.

Са свайго боку У. Чэрчылю было надзвычай важна на зыходзе Другой Сусветнай вайны выратаваць Брытанскую імперыю ад распаду, калі не ў сяброўстве з І. Сталіным, то хоць бы пры нейтралітэце з яго боку [1, с. 220].

Якраз вышэйакрэсленыя абставіны спрычыніліся да тых рашэняў, якія былі прыняты лідэрамі “вялікай тройкі” на Крымскай канферэнцыі. Гэтыя рашэнні можна вызначыць як трыумф савецкай знешняй палітыкі. Падставамі для такой высновы з’яўляюцца:

1. Удзельнікі канферэнцыі ў Ялце дамовіліся аб пасляваенным лёсе ўсходнееўрапейскіх народаў, якія, як дэкларавалася, створаць у сябе дэмакратычныя рэжымы пры свабодных тайных выбарах. У сувязі з гэтым падкрэслівалася, што ўрады СССР, ЗША і Вялікабрытаніі будуць дапамагаць усходнееўрапейскім народам ствараць часовыя органы ўлады, якія будуць прадстаўляць усе дэмакратычныя элементы насельніцтва і якія ў бліжэйшы час шляхам свабодных выбараў утвораць урады, адпавядаючыя волі народаў. Такія абяцанні “дэмакрат” І. Сталін даў і ў адносінах да ўсіх яшчэ невызваленых краін Усходняй Еўропы. Аднак Чырвоная Армія, уступаючы ва Усходнюю Еўропу, ужо везла ў сваім абозе камуністычных кіраўнікоў для кожнай вызваленай краіны – усіх гэтых дзімітравых, готвальдаў, ракашы, ульбрыхтаў, – якія неадкладна прыступалі да саветызацыі сваіх краін і народаў.

Такім чынам, галоўнае пытанне Крымскай канферэнцыі – пасляваенны лёс усходнееўрапейскіх народаў – фармальна вырашалася у дэмакратычным духу, шляхам волевыяўлення саміх народаў, аднак без вызначэння рэальных механізмаў уздзеяння ЗША і Вялікабрытаніі на вырашэнне гэтага пытання.

2. У адпаведнасці з крамлёўскімі інтарэсамі на канферэнцыі было вырашана і пытанне аб лёсе Польшчы. Калі гаварыць больш дакладна, то яно было вырашана на карысць Масквы яшчэ задоўга да Крымскай канферэнцыі. Калі ў ліпені 1994 года Чырвоная Армія наблізілася да



Рэпазіторый ВДУ

межаў Польшчы У. Чэрчыль і Ф. Рузвельт звярнуліся да І. Сталіна з просьбай не вырашаць палітычную будучыню Польшчы ў аднабаковым парадку, без уліку падыходаў усіх польскіх дэмакратычных сіл, у тым ліку без удзелу польскага ўрада ў эміграцыі (у Лондане), на што была дадзена згода. І. Сталін тады заявіў, што савецкі ўрад імкнецца “видеть Польшу сильной, независимой, демократической, а советско-польские отношения – добрососедскими и основанными на прочной дружбе» [3, с. 156]. Аднак палітычнае кіраўніцтва СССР неўзабаве зрабіла стаўку на прасавецкія сілы ў Польшчы, якія групаваліся вакол Польскага Камітэту Нацыянальнага Вызвалення і адмовілася ад супрацоўніцтва з польскім урадам у Лондане начале з Мікалайчыкам.

На просьбу Ф. Рузвельта да І. Сталіна не прызнаваць створаны напрыканцы снежня 1944 года ў Любліне Часовы ўрад Польшчы, які быў складзены з аднародных (прасавецкіх) палітычных сіл, І. Сталін даў Ф. Рузвельту наступны адказ: “Дело в том, что 27 декабря Президиум Верховного Совета СССР на соответствующий запрос поляков уже сообщил, что он намерен признать Временное Правительство Польши, как только оно будет сформировано. Это обстоятельство делает меня бессильным выполнить Ваше пожелание» [3, с. 195]. Згода І. Сталіна на Крымскай канферэнцыі ўключыць у склад Часовага польскага ўраду дэмакратычных дзеячаў з самой Польшчы, а таксама з-за яе межаў, па-сутнасці нічога не змяняла ў палітычнай афарбоўцы гэтага ўраду і не змяншала магчымасці савецкага кіраўніцтва яго кантраляваць.

Неабходна таксама зазначыць, што да пачатку Крымскай канферэнцыі былі ўжо вызначаны і тэрытарыяльныя межы польскай дзяржавы, якія на Ўсходзе абмяжоўваліся так званай “лініяй Керзана”, вызначанайу якасці савецка-польскай мяжы Вярхоўнай радай Антанты ў 1919 годзе. Такое рашэнне поўнасцю задаволіла савецкае кіраўніцтва, бо ў сферу ўплыву СССР траплялі Заходняя Беларусь, Заходняя Украіна і Літва.

3. Задаволілі савецкае кіраўніцтва і вызначаныя Крымскай канферэнцыяй падыходы да вырашэння германскага пытання.

Завяршылася Крымская канферэнцыя прыняццем яе ўдзельнікамі Дэкларацыі аб вызваленай Еўропе, якая падцвярджала права ўсіх народаў свабодна выбіраць форму праўлення і ствараць дэмакратычныя ўстановы па іх уласнаму выбару. Савецкі Саюз, Вялікабрытанія і ЗША абавязаліся аказваць у гэтым дапамогу вызваленым народам.

З пункту гледжання пасляваеннай будучыні Еўропы Крымская канферэнцыя была запозненай спробай заходніх саюзнікаў выратаваць усходнееўрапейскія краіны ад савецкага занявольвання. На самой справе атрымалася міжвольная санкцыя заходніх краін на падзел Еўропы, якая ў многім была прадвызначана тагачаснымі палітычнымі і ваеннымі інтарэсамі гэтых краін, аб якіх гаварылася вышэй. Гэты падзел прадвызначыў лёс кантынента да канца 1980-х гадоў, калі ў выніку заканчэння “халоднай вайны”, аб’яднання Геманії і дэмакратычных рэвалюцый ва Ўсходняй Еўропе было скончана з ялцінска-патсдамскай сістэмай пасляваенага ўладкавання Еўропы.

Літаратура

1. Авторханов, А. Империя Кремля / А. Авторханов // Prometeus-Verlag, Postfach. 1746. – D. 8100 Garmisch-Partenkirchen. Federal Republik of Germany, 1988. – 425 с.
2. Переписка Председателя Совета Министров СССР с президентами США и премьер-министрами Великобритании во время Великой Отечественной войны 1941–1945 гг. В 2-х т. – 2-е изд. – Москва: Политиздат, 1976. – Т. 1. Переписка с У. Черчиллем и К.Эттли (июль 1941 г. – ноябрь 1945 г.). – 472 с.
3. Переписка Председателя Совета Министров СССР с президентами США и премьер-министрами Великобритании во время Великой Отечественной войны 1941–1945 гг. В 2-х т. – 2-е изд. – Москва: Политиздат, 1976. – Т. 2. Переписка с Ф. Рузвельтом и Г. Трумэном (август 1941 г. – декабрь 1945 г.). – 327 с.

Репозиторий ВГУ